*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА
РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 46 (60) Аўторак, 25 верасня 1945 г.

## 25-ГОДДЗЕ КОМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

Учора комсамол Беларусі адзначаў 25-годдзе свайго існавання.

Слаўны баявы шлях прайшоў Ленінскі комуністычны саюз моладзі за гэты час. Народжаны ў агні грамадзянскай вайны, ён усе свае сілы, усю сваю кіпучую энергію аддаваў служэнню соцыялістычнай Радзіме.

У цяжкія годы грамадзянскай вайны комсамол Беларусі са зброяй у руках абараняў маладую совецкую рэспубліку ад нямецкіх і белапольскіх захопнікаў.

У годы мірнага соцыялістычнага будаўніцтва комсамол Беларусі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, у першых радах працаваў над росквітам сваёй рэспублікі. Іх рукамі будаваліся фабрыкі і заводы, узоры працы паказвалі комсамольцы на калгасных і соўгасных палёх.

Назаўсёды застануцца ў памяці подзвігі комсамольцаў і іх выхавальнікаў у годы Вялікай Айчыннай вайны. Сотні і тысячы беларускіх юнакоў і дзяўчат змагаліся на франтах і ў партызанскіх атрадах супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Толькі ў нашым раёне дзейнічала супроць немцаў 200 комсамольцаў-партызан, 270 чалавек у падполлі.

Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй Совецкай Беларусі ад іга нямецкіх захопнікаў комсамольцы і моладзь рэспублікі актыўна ўдзельнічаюць у рабоце па аднаўленню і далейшаму развіццю народнай гаспадаркі, аднаўленню культуры беларускага народа і хутчэйшай ліквідацыі нямецкай акупацыі. Няма ніводнай галіны палітычнага або гаспадарчага жыцця нашай краіны, дзе комсамольцы не былі-б ініцыятарамі правадзімых мерапрыемстваў.

Рыхтуючы падарункі да 25-ай гадавіны комсамола Беларусі, комсамольцы нашага раёна поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках, здалі 12,5 тон хлеба ў фонд Чырвонай Арміі.

Адзначаючы гістарычную дату—25-годдзе комсамола Беларусі, комсамольцы, да канца адданыя сваёй Радзіме, прыкладуць усе свае сілы і энергію на хутчэйшае залячэнне ран, нанесеных вайной народнай гаспадарцы, на далейшае ўмацаванне магутнасці соцыялістычнай Айчыны.

## Чырвоныя абозы ў чэсць маладзёжнага свята

Зварот комсамольцаў і моладзі Тамашэўскага сельсовета, Дамачэўскага раёна, аб стварэнні комсамольска-маладзёжнага фонда Перамогі ў чэсць 25-годдзя комсамола Беларусі, знайшоў жывейшы водгук сярод комсамольцаў і моладзі нашага раёна. 23 верасня комсамольцы і моладзь Іваўскага сельсовета чырвоным абозам даставілі на пункт Заготзерно 2 тоны збожжа. Хлеб у фонд Перамогі даставілі з Галоўчыцкага, Худлінскага, Дзеткаўскага, Ошчэўскага сельсоветаў.

## Комсамольцы ў барацьбе за хлеб

У страдную пору, калі на палях кіпела ўпартая праца, комсамольцы раёна з'явіліся ініцыятарамі ў справе ўборкі ураджаю ў тэрмін і без страт. Комсамольцы па раёну арганізавалі 20 комсамольска-маладзёжных брыгад для аказання дапамогі ва ўборцы ураджаю сем'ям франтавікоў. Брыгада комсамольцаў і несаюзнай моладзі Іваўскага сельсовета работала на ўборцы каля трох тыдняў. Яны дапамаглі многім сем'ям воінаў ва ўборцы ураджаю, а таксама ўбралі жыта многадзетнай маці Гурыш, якая мае 11 непрацаздольных дзяцей.

Комсамольцы з'явіліся ў першых радах хлебаздатчыкаў. Па раёну ўжо ўсе комсамольскія арганізацыі разлічыліся з дзяржавай па пастаўках збожжа дзяржаве і здалі ў фонд Чырвонай Арміі 12,5 тон.

Вялікую работу за датэрміновае выкананне збожжапаставак дзяржаве праводзяць комсамольцы сярод сялян. Прыкладам у гэтым служыць Галоўчыцкая комсамольская арганізацыя (сакратар т. Ваўрук). Комсамольцы гэтай арганізацыі маюць у вёсках свае адпаведныя ўчасткі, дзе праводзяць сярод сялян чыткі газет, выпускаюць баявыя лісткі, дзе асвятляецца ход хлебапаставак.

Нараду з выкананнем хлебапаставак комсамольцы актыўна ўключыліся ў правядзенне азімай сяўбы.

**Мацюхова,**
заг. улікам РК ЛКСМБ.

### ЗДАЧА БУЛЬБЫ ДЗЯРЖАВЕ

Пачалася ўборка бульбы і здача дзяржаве. Сяляне Акцябрскага сельсовета здалі дзяржаве 26,5 тон бульбы, Каменскага—20 тон і інш. Па раёну здана дзяржаве 143 тоны бульбы.

Парада агранома

# АДБОР НАСЕННАЙ БУЛЬБЫ

Бульба ў нас у гаспадарцы займае значнае месца. Пад пасеў гэтай культуры занімаецца да 20 процантаў усёй пасеўнай плошчы. Бульба мае выключна важнае значэнне ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, яна ідзе на папаўненне харчовых рэсурсаў нашай краіны. А паэтаму гэтай вельмі важнай культуры патрэбна прыдаць асобую ўвагу, накіраваць усе стараннi на павышэнне ўраджаю.

Акрамя добрай апрацоўкі глебы і ўгнаення—вялікую ролю ў павышэнні ўраджаю бульбы мае адбор насення.

Неаднаразовыя вопыты даказалі, што ёсць выпадкі, калі на адным полі, пры аднолькавай апрацоўцы, атрымана некалькі розных вынікаў ураджаю ў залежнасці ад сорта.

Пагэтаму трэба цікавіцца ўраджаем бульбы розных сартоў і набываць больш ураджайныя.

Для атрымання добрага насення, неабходна зараз, у час копкі, праводзіць адбор бульбы лепшых сартоў кожнага куста. Пры ўборцы бульбы, на насенне адбіраць клубні з самых ураджайных кустоў вагою 50—60 грам, прыкладна велічынёю з курынае яйцо, і адкладваць іх асобна на захаванне. Ні ў якім выпадку не трэба адбіраць насенне з-пад кустоў, дзе хаця адзін клубень пойдзе захвораны, а таксама дзе вельмі з нізкай ураджайнасцю—з многалікімі і маленькімі клубнямі.

У інстытуце бульбавай гаспадаркі быў атрыманы наступны вынік вопыту: на участку 100 квадратных метраў насенне без адбора дало 211 кілограм бульбы, а адобранае—281 кілограм пры ўсіх аднолькавых умовах.

Пажадана, каб у гэтым годзе кожная гаспадарка зрабіла-б адбор бульбы на насенне па некалькі цэнтнераў. Гэта можна зрабіць усім.

Сяляне і сялянкі, адбірайце пры копцы лепшае насенне бульбы, гэтым самым паднімеце ўраджай да 30 процантаў!

**В. Барысюк,**
галоўны агроном райзямаддзела.

# Па Совецкаму Саюзу

Гэтымі днямі ўся наша краіна шырока адзначала 200-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага палкаводца Міхаіла Іларыёнавіча Кутузава. Згодна рашэння Соўнаркома СССР у Маскве і на Барадзінскім полі Кутузаву будуць пабудаваны помнікі. Акрамя таго, на Барадзінскім полі будуць устаноўлены помнікі баявым саратнікам Кутузава—Баграціёну і Барклаю-дэ-Толлі.

* * *

Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах Совецкага Саюза пачаліся вучэбныя заняткі. У гэтым годзе навучанне праходзіць у 762 ВНУ. У тым ліку больш 200 ВНУ, аднаўленых у вызваленых раёнах. На першы курс вышэйшай школы ў гэтым годзе паступіла 176 тысяч студэнтаў. Усяго ў вышэйшай школе прыступіла да заняткаў 560 тысяч студэнтаў.

* * *

З 184 цукровых заводаў, якія працавалі на Украіне да вайны, у гэтым годзе будзе дзейнічаць 124—на 33 заводы больш, чым у мінулым годзе. Заводы Украіны дадуць краіне ўдвая больш цукру, чым у мінулым годзе.

* * *

У Туле, якая здаўна славілася вырабам самавараў, зноў разгарнуў сваю вытворчасць завод самавараў, выпускаўшы ў час вайны абаронную прадукцыю. Завод штодзённа вырабляе 100 самавараў і 250 прымусаў. Да канца года выраб узрасце больш чым у два разы.



Звеннявая соўгаса „Пролетарый", Вязнікоўскага раёна, Уладзімірскай вобласці, Ф.К. Токарэва, узнагароджаная за высокія ўраджаі бульбы ордэнам Леніна.

Фото А. Сідарава
Фотахроніка ТАСС.

# За рубяжом

У нямецкім горадзе Люнебурге, бліз Гамбурга, пачаўся судовы працэс над 45 ваеннымі злачынцамі—віноўнікамі гібелі 45 тысяч чалавек. Перад судом прадсталі гітлераўскія каты, якія арудавалі ў „лагеры смерці" у Бельзене. У гэтым лагеры ў момант заняцця Бельзена англійскімі войскамі пакутвала 12 тысяч мужчын, 28 тысяч жанчын і 500 дзяцей. З прычыны знясілення ніхто з іх не мог падняцца насустрач сваім вызваліцелям. 13 тысяч з іх памерла пасля вызвалення, не гледзячы на неадкладную медыцынскую дапамогу брытанскіх урачоў. Акрамя таго, знойдзена 13 тысяч непахаваных трупаў. У лагеры панавалі тыф і дызентэрыя. Сярэдняя працягласць жыцця зняволенага вылічвалася 12 днямі. Англійскія войскі захапілі адміністрацыю лагера на чале з яго начальнікам Крамерам. Гітлераўскія каты прадсталі перад вярхоўным ваенным судом англійскай акупацыйнай зоны Германіі.

Выступіўшы на судзе пракурор у прамове намаляваў страшэнны малюнак жудасных злачынстваў, якія мелі месца ў Бельзіне.

* *

У польскім горадзе Катовіцы адбыліся вялікія ўрачыстасці ў сувязі з узнагароджаннем першай польскай арміі крыжам Грунвальда 1 класа. На ўрачыстасць сабраліся тысячы жыхароў Катовіц. Выступіўшы на мітынгу прэм'ер-міністр Польшчы Осубка-Маравускі заявіў, што першая польская армія з'яўляецца ядром і гордасцю польскага войска. Пералічыўшы шматлікія баявыя заслугі першай польскай арміі, якая поплеч з Чырвонай Арміяй змагалася за вызваленне Польшчы ад нямецкіх захопнікаў, Осубка-Маравускі заявіў, што гэтая барацьба польскага войска звязала Польшчу неразрыўнай дружбай з вялікім Совецкім Саюзам.

* *

У французскім горадзе Тулузе мелі месца народныя хваляванні. Галодныя натоўпы, абураныя высокімі цэнамі на прадукты харчавання ўварваўся ў прадавольсцвенныя магазіны і захапіў знаходзіўшыяся там прыпасы. Паліцыя арыштавала шмат жыхароў горада. Тулуза аб'яўлена на поўасадным становішчы.

* *

У Злучаных Штатах Амерыкі выбухнулі забастоўкі. Бастуюць каля 215 тысяч рабочых. На аўтамабільных прадпрыемствах Форда ў горадзе Дэтройце бастуе 84 тысячы чалавек. Кіраўнікі профсаюза аўтамабільных рабочых абмяркоўваюць пытанне аб абвяшчэнні забастоўкі на іншых аўтазаводах, на якіх занята звыш мільёна рабочых.

(ТАСС).

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14867 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.